«ПРЫХАДЗІ ХУТЧЭЙ, ВЯСНА!»

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Тое, што і ўзгорак. На ім збіралася моладзь, гукаючы вясну; звычайна гуканне вясны адбывалася на вясенняе свята Саракі, 22 сакавіка, у дзень вясенняга раўнадзенства. **5.** Масавая народная гульня, якая, як і гушканне на арэлях, выконвала на гуканні вясны магічную функцыю. **7.** Вялікае лісцевае дрэва. **8.** Сістэма ўмоўных абазначэнняў, сігналаў, якія перадаюць інфармацыю. **11.** «..., ранняя птушачка, // Чаго так рана з выраю вылятаеш?» З вяснянкі, якую дзяўчаты спявалі, гукаючы вясну. **15.** «Пахнуць далі бярозавым сокам, // Чарназёмнаю пахнуць вясной». З верша М. Багуна «Вясновы ...». **16.** «Пагрэцца сеў на комін // Абветраны ...» З верша Ул. Мазго «Халодная вясна». **17.** Тое, што і стос. **18.** Калі на Саракі на стрэхах ляжыць ..., то на Дабравешчанне ... будзе пакрываць усю зямлю (прыкм.). **21.** Чытанне ўголас. **22.** Невялікі грамадскі парк. **27.** Бярозавы сок. **30.** Травяністая расліна з прыемным пахам. **31.** Урачысты верш. **32.** «... бушуе — вясну чуе, // Воран крача — сыру хоча. // Дзеўка плача — замуж хоча». З вяснянкі. **33.** «Карагоды ля ракі // І падружкі, і вянкі, // І ... новыя. // Смачны сны вясновыя». З верша П. Броўкі «Настачка». **34.** Шчырасць.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 2. ... з гор, і рыба з нор (прык.). **3.** Адлюстраванне каго-, чаго-небудзь у карыкатурным выглядзе. **4.** Вясной цэбар вады — лыжка гразі, а восенню лыжка вады — ... гразі (прык.). **6.** Тое, што і батлейка. **8.** Чатырохколавы конны экіпаж; паводле вяснянак, менавіта на ... прыбывае на зямлю вясна. **9.** Рэальнасць, рэчаіснасць. **10.** Ніз судна. **12.** Раздзел метэаралогіі; 23 сакавіка працаўнікі беларускай гідраметэаралагічнай службы адзначаюць сваё прафесійнае свята. **13.** «Вясна ж мая, вясненачка, // Дзе ж твая дочка — ...? // — Мая дочка ў садочку». З вяснянкі. **14.** Тонкі слой ледзяных крышталяў на паверхні чаго-небудзь. **19.** Печаныя вырабы, якія на Саракі выпякалі ў выглядзе птушак: кулікаў, буслоў, жаўрукоў. **20.** «Прыхадзі хутчэй, вясна: // Ты — крылатая зарніца, // Ты — прызыўная ..., // Ты — дзяўчынка-чараўніца». З паэмы Я. Коласа «Сымон — музыка». **23.** «Стаіць вярба ў канцы сяла. // На той вярбе ... кветачкі». З вяснянкі. **24.** Пра таго, хто ўмее добра ездзіць. **25.** ... салдаты — не войска, ... дубы — не дуброва (прык.). **26.** Калі ... прыляцеў да 14 сакавіка — быць лету мокраму, а снег рана сыдзе (прыкм.). 27. Мучны выраб, спечаны на патэльні. **28.** Страва са звараных круп. У час гукання вясны закопвалі ў зямлю гаршчок ..., аддаючы тым самым ахвяру зямлі. **29.** На Рыгора (25 сакавіка) зіма ідзе ў ... (прык.).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

Праверце, калі ласка, адказы

Па гарызанталі: 1. Узвышша. 5. Карагод. 7. Вяз. 8. Кол. 11. Жаваранак. 15. Зоскі 16. Бацян. 17. Кіна. 18. Снег. 21. Чытка. 22. Скверр. 27. Бярозавік. 30. Аер. 31. Ода. 32. Вон. 33. Сукенкі. 34. Прамата. **Па вертыкалі:** 2. Вада. 3. Шарж. 4. Вядро. 6. Раёк. 8. Кавята. 9. Ява. 10. Дно. 12. Сіноптыка. 13. Пашенька. 14. Іней. 19. Печыва. 20. Струна. 23. Трыі. 24. Ядок. 25. Два. 26. Грак. 27. Бліч. 28. Каша. 29. Мора.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.30	19.10	11.40
Віцебск —	7.20	18.59	11.39
Магілёў —	7.20	19.00	11.40
Гомель —	7.16	18.57	11.41
Гродна —	7.45	19.25	11.40
Брэст —	7.45	19.26	11.41

Месяц

Апошняя квадра 9 сакавіка.
Месяц у сузор'і Вадаліва.

Імяніны

Пр. *Марыны, Арсенія, Васіля, Івана, Мікалая, Несцера.*
К. *Бажэны, Хрысціны, Марка, Нікіфара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

13 САКАВІКА

У краіне

1820 год — была закрыта Полацкая езуіцкая акадэмія. Гэта першая вышэйшая навучальная ўстанова на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў 1812—1820 гадах. Адкрыта ў 1812 годзе на базе Полацкага езуіцкага калегіума, які дзейнічаў з 1580 года як сярэдняя навучальная ўстанова. Валодала правамі ўніверсітэта, мела ў сваім складзе тры факультэты: тэалагічны, філасофскі, свабодных навук і старажытных і сучасных моў. Пры акадэміі была найбуйнейшая ў Беларусі бібліятэка, на 1812 год яна налічвала каля 40 тысяч тамоў. Выкладанне вялося па падручніках заходнееўрапейскіх універсітэтаў, а таксама па ўласных, якія выходзілі ў акадэмічнай друкарні. Выпускнікі атрымлівалі чын 14-га класа і маглі паступаць на дзяржаўную службу. Акадэмія мела права прысвойваць навуковыя ступені магістраў свабодных навук і філасофіі, дактароў тэалогіі, грамадзянскага і кананічнага права. Сярод выпускнікоў — пісьменнік Я. Баршчэўскі, мастак В. Ваньковіч, філосаф А. Даўгірд і інш. Акадэмія была закрыта ў сувязі са скасаваннем ордэна езуітаў у Расійскай імперыі.

1863 год — выйшаў царскі ўказ аб увядзенні абавязковага выкупу сялянскіх надзелаў у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай губернях і ў інфлянцкіх паветах Віцебскай губерні; 14 лістапада 1863 года дзеянне ўказа распаўсюджана на ўсю Віцебскую і Магілёўскую губерні.

1898 год — 13—15 сакавіка ў Мінску адбыўся нелегальны Першы з'езд РСДРП. Абвясціў стварэнне Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. З'езд праходзіў на кватэры сацыял-дэмакрата П. В. Румянцава. Прысутнічала дзевяць дэлегатаў ад шасці найбольш буйных сацыял-дэмакратычных партый. Было праведзена шэсць пасяджэнняў; запісваліся толькі рэзалюцыі. З'езд прыняў рашэнне аб'яднаць усе «Саюзы барацьбы», групу «Рабочей газеты» і Бунд у адзіную партыю і назваць яе Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыяй. З'езд выбраў ЦК з трох членаў (С. І. Радчанка, Б. Л. Эйдэльман, А. І. Крэмер), прызнаў «Рабочую газету» афіцыйным органам партыі, вырашыў выпусціць Маніфест партыі. Маніфест РСДРП і рашэнні з'езда надрукаваны ў красавіку 1898 года ў Бабруйску. Пасля з'езда сацыял-дэмакратычныя арганізацыі і саюзы сталі называцца камітэтамі РСДРП. Аднак партыя як адзіная сацыял-дэмакратычная арганізацыя яшчэ не была створана: не былі прыняты статут і праграма; пасля з'езда восем з дзевяці дэлегатаў былі арыштаваны; друкарню «Рабочей газеты» захапіла паліцыя.

У свеце

1733 год — нарадзіўся Джозеф Прыстлі (1733—1804), англійскі хімік, філосаф-матэрыяліст і грамадскі дзеяч. У сваёй працы «Даследаванні аб матэрыі і духу» (1770) сцвярджаў, што прырода матэрыяльная, дух — уласцівасць матэрыі. Адкрыў кіслород, атрымаў хлорысты вадарод і аміяк.

1888 год — нарадзіўся Антон Сямёнавіч Макаранка (1888—1939), савецкі педагог, пісьменнік. Распрацаваў і ажыццявіў бяспрыкладную ў педагагічнай практыцы спробу масавага перавыхавання дзяцей-правапарушальнікаў у працоўнай калоніі імя М. Горкага і дзіцячай камуне імя Ф. Дзяржынскага.

УСМІХНЕМСЯ

У продаж паступіла новая, вельмі эфектыўная мазь для лыж.

Зробленая яна на аснове шкіпінару, прычым нашмароўваецца не на лыжы.

Сустракаюцца два падабцаснікі:

— Я ўчора сваю к чорту паслаў!

— Ды ідзі ты! І за што?

— Яна мяне: «Ідзі вынесі смецце!»

— Ну, а ты?

— А я ёй: «Ды пайшла ты к чорту! Я яшчэ не дамыў!»

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1069.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 сакавіка 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12